временные проблемы науки и образования : электронный научный журнал. – Режим доступа : http://www.science-education.ru/pdf/2014/4/510.pdf.

*4.* Лекция 6. Возможные границы фундаментального физического познания [Электронный ресурс] // Учебно-научный центр. – Режим доступа: http://newuc.jinr.ru/img_sections/file/Aspirant/Erekaev/Granicy. pdf.

5. *Малахова В. Г.* Становление целостного подхода в философии и истории науки [Электронный ресурс] / В. Г. Малахова // Грани познания : научно-образовательный журнал. – Режим доступа : http://grani.vspu.ru/files/publics/1405590494.pdf.

*6.* Социальный интеллект в структуре межкультурной коммуникации [Электронный ресурс] // МГИМО. – Режим доступа : http://mgimo.ru/files/45779/45779.pdf.

*7. Стебельска, О.* Інтегральний характер квантового підходу до вивчення природи свідомості [Электронный ресурс] / О. Стебельска // Національна бібліотека України імені В. І. Вернадського. – Режим доступа : http://irbis-nbuv.gov.ua/cgi-bin/irbis_nbuv/cgiirbis_64.exe?C21COM=2&I21DBN=UJRN&P21DBN=UJRN&IMAGE_FILE_DOWNLOAD=1&Image_file_name=PDF/Nvvnufn_2013_11_13.pdf.

*8. Черепанова, С. О.* Філософія освіти: ідея цілісності людини і модальність можливого / С. О. Черепанова // Ученые записки Таврического нац. ун-та им. В. И. Вернадского. Сер. «Философия. Культурология. Политология». – 2011. – Т. 24(63). – № 3/4. – С. 45–53.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МАНІТОРЫНГ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ПРАДУКЦЫІ БІБЛІЯТЭК У СІСТЭМЕ СРОДКАЎ ІНАВАЦЫЙНАГА МЕНЕДЖМЕНТУ

***С. В. Зыгмантовіч,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Інтэнсіўнасць і шматлікасць сацыяльна-эканамічных, інфармацыйна-тэхналагічных пераўтварэнняў практычна ва ўсіх сферах грамадства выклікаюць павышаную цікавасць у спецыялістаў, сучаснікаў. Гэта праяўляецца ў актывізацыі навуковых даследаванняў, у імкненні дакументаваць гістарычны вопыт, фіксіраваць вынікі назіранняў, абагульняць заканамернасці і прагназаваць. Гэта ў поўнай ступені адносіцца і да бібліяграфічнай

дзейнасці бібліятэк. Тым больш, што сярод важнейшых функцый сучасных бібліятэк выступаюць навуковая, упраўленчая, метадычная, інавацыйная.

Сярод аб'ектаў аналізу, навуковых даследаванняў выступалі і павінны выступаць вынікі складальніцкай бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк. Складальніцкая бібліяграфічная дзейнасць, накіраваная на падрыхтоўку бібліяграфічнай прадукцыі, – важнейшая складаючая работы любой бібліятэкі, незалежна ад яе статусу. На яе змест, характар, вынікі аказваюць уплыў разнастайныя фактары: сацыякультурныя, ідэалагічныя, эканамічныя, інфармацыйна-тэхналагічныя, матэрыяльна-тэхнічныя, кадравыя і інш. Таму названы аб'ект даследавання, з аднога боку, можна разглядаць як адзін з сістэмных індыкатараў развіцця грамадства цалкам, таму што накіраванасць і здольнасць бібліяграфічнай інфармацыі праз адлюстраванне дакументнага патоку акумуліраваць у сваім інфармацыйным патэнцыяле дынаміку сацыяльных сэнсаў, адлюстроўваць тэндэнцыі развіцця грамадства дазваляе разглядаць яго як спецыфічную інфармацыйную мадэль рэальнасці і інфарматыўна ёмкі аб'ект даследавання грамадскіх, сацыяльна-культурных пераўтварэнняў. З другога боку, вывучэнне бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэк з'яўляецца вельмі важным для ацэнкі вынікаў непасрэдна прафесійнай бібліяграфічнай дзейнасці, вызначэння тэндэнцый яе развіцця, пошуку заканамернасцей і інавацый.

У сучаснай практыцы сацыяльнага пазнання і кіравання сацыяльнымі аб'ектамі вылучаюцца разнастайныя тэхналогіі, метады. Цікавасць для нас у кантэксце разглядаемага аб'екта ўяўляе тэхналогія інфармацыйнага маніторынга.

Інфармацыйны маніторынг аб'ектыўна прадугледжвае працэс бесперапыннага назірання за самім працэсам складальніцкай бібліяграфічнай дзейнасці, выяўлення яго заканамернасцяў і ўстанаўлення карэляцый паміж тэндэнцыямі змен у бібліятэчна-бібліяграфічнай рабоце і развіццём сучаснага соцыуму. Асобае значэнне інфармацыйнага маніторынга заключаецца ў тым, што ён з'яўляецца сродкам перадачы сацыяльнага вопыту, дазваляе прагназаваць развіццё вынікаў бібліяграфічнай работы, пазбягаць крытычных сітуацый за кошт таго, што ў інфармацыйным маніторынгу параўноваецца стан даследуемага аб'екта ў дадзены прамежак часу з яго станам ў папярэдні перыяд часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыйны маніторынг з’яўляецца сродкам кіравання інфармацыйным асяроддзем, якое сення ўсё больш мае патрэбу ў навуковым абгрунтаванні ўпраўленчых рашэнняў; сродкам распрацоўкі метадычных рэкамендацый, пошуку інавацыйных прадуктаў, тэхналогій, метадаў работы для іх вывучэння, распаўсюджвання сярод іншых суб’ектаў дзейнасці.

У дачыненні да менеджменту дзейнасці бібліятэк, і ў тым ліку бібліяграфічнага інавацыйнага менеджменту, неабходна адзначыць і магчымасць на падставе сістэм маніторынга бібліяграфічных рэсурсаў вырашаць наступныя задачы:

– прагназаванне падрыхтоўкі бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэкамі;

– планаванне складальніцкай бібліяграфічнай дзейнасці як у межах бібліятэкі, так і зводнае планаванне ва ўмовах карпаратыўнага ўзаемадзеяння, ва ўмовах пэўных тэрытарыяльных аб’яднанняў (рэспубліканскага, рэгіянальнага, мясцовага), сумеснай работы з іншымі суб’ектамі як сістэмы дакументных камунікацый, так і навуковымі, вучэбнымі, вытворчымі, грамадскімі арганізацыямі;

– папярэджванне дубліравання ў складальніцкай бібліяграфічнай рабоце;

– улік бібліяграфічных рэсурсаў як састаўной часткі дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў;

– аналіз і вылучэнне навацый як у самой бібліяграфічнай дзейнасці, так і ў яе выніках, звязаных з вылучэннем новых відаў, жанраў дапаможнікаў, з прымаемымі метадычнымі рашэннямі, звязаннымі з аб’ектамі бібліяграфавання, спосабамі прадстаўлення бібліяграфічнай інфармацыі, разнастайнымі метадычнымі рашэннямі;

– кантроль за якасцю бібліяграфічных крыніц;

– забеспячэнне празрыстасці дзейнасці бібліятэк і фарміраванне іміджа бібліятэк як сучасных інфармацыйных устаноў;

– магчымасць вызначэння лепшых бібліятэк і больш прадукцыйных па падрыхтоўцы бібліяграфічных рэсурсаў.

У арганізацыйным плане правядзеннем маніторынга бібліяграфічных рэсурсаў павінны займацца бібліятэкі-метадычныя цэнтры, і ў прыватнасці сумесна аддзелы маркетынгу і бібліяграфічныя або навукова-даследчыя аддзелы бібліятэказнаўства і бібліяграфічныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэхналогія маніторынга бібліяграфічных рэсурсаў заснавана на пастаянным назіранні за папаўненнем дакументнага патоку новымі звесткамі аб плануемых, падрыхтаваных, выдадзеных бібліяграфічных крыніцах і складаецца з трох паслядоўна звязаных тэхналагічных працэсаў.

Першы працэс – бібліяграфічны маніторынг. Ён ажыццяўляецца традыцыйнымі метадамі выяўлення бібліяграфічных рэсурсаў і іх апісання, прадугледжвае стварэнне базы данных і інверціраваных ключэй да яе па прыкметах дакументаў, якія ўваходзяць у прагнозныя індыкатары.

Вынікам маніторынгу бібліяграфічных рэсурсаў звычайна выступаюць крыніцы метабібліяграфіі – планы падрыхтоўкі і выпуску бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэкамі, паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў, каталогі бібліяграфічных (інфармацыйных) рэсурсаў. Да такіх крыніц, ствараемых у нашай краіне, адносяцца штогоднік «Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў» Нацыянальнай кніжнай палаты, каталог «Информационные ресурсы и системы Беларуси» НІРУП «Інстытут прыкладных праграмных сістэм», база данных НББ «Бібліятэкі Рэспублікі Беларусь і замежных краін» з рубрыкай «Электронныя інфармацыйныя рэсурсы». Але іх аналіз дазваляе сцвярджаць, што і ў сукупнасці яны не вырашаюць праблему наяўнасці неабходнай базы для пастаяннага маніторынга бібліяграфічнай прадукцыі, ствараемай бібліятэкамі краіны. У названых крыніцах рассеяна інфармацыя, якая тычыцца бібліятэк; не прыходзіцца гаварыць аб паўнаце ўліку ўсіх ствараемых бібліятэкамі рэсурсаў; страдае аператыўнасць аднаўлення інфармацыі; не адлюстроўваюцца электронныя бібліяграфічныя рэсурсы, прадстаўленыя на лакальных носьбітах і на сайтах большасці бібліятэк. Таму актуальнай прадстаўляецца задача аднаўлення ў краіне практыкі вядзення зводнага паказальніка, зводнай базы даных, дзе адлюстроўвалася б інфармацыйная, бібліяграфічная прадукцыя бібліятэк. Аналагічныя базы даных могуць генерыравацца і на рэгіянальным узроўні, і па відах бібліяграфічнай, інфармацыйнай прадукцыі бібліятэк. Патрэбнасць у такіх зводных рэсурсах існуе і для рэалізацыі ўпраўленчых, метадычных функцый, і ў мэтах ўзаемавыкарыстання вынікаў бібліяграфічнай дзейнасці.

Другі працэс – статыстычны маніторынг. Ён прадугледжвае колькасны аналіз патоку бібліяграфічных рэсурсаў, вызначэння



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дынамікі яго развіцця па розных паказчыках (змест рэсурсаў, суб'екты падрыхтоўкі, віды бібліяграфічных крыніц па розных прыкметах, тыпах, формах, носьбітах прадстаўленай інфармацыі і г. д). Сярод метадаў колькаснага аналізу – састаўленне табліц і пабудова графікаў, вылічэнне сярэдніх паказчыкаў, вылічэнне каэфіцыента карэляцыі па суадносінах паміж з'явамі, падзеямі, мадэляванне. Канчатковы вынік статыстычнага маніторынга – даныя аб масівах і патоках бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэк, асобных, канкрэтных крыніцах інфармацыі, звесткі і факты з прадстаўленых крыніц.

Сення вынікі статыстычнага маніторынгу прадстаўлены ў справаздачах бібліятэк, аналітычных матэрыялах бібліятэк – метадычных цэнтраў, навуковых артыкулах па пытаннях бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк. Разам з тым адсутнасць адзінай і поўнай крыніцазнаўчай базы не дазваляе гаварыць аб паўнаце прадстаўленай інфармацыі ў названых вышэй матэрыялах. Іх адрознівае фрагментарнасць, залежнасць ад лакальных мэтаў, вырашаемых у кожным канкрэтным выпадку. І таму вызначэнне перыяду, канкрэтнага дакладнага часу з'яўлення новых відаў, тыпаў, жанраў бібліяграфічных рэсурсаў, якія рыхталіся, генерыраваліся бібліятэкамі, безумоўна, абцяжарваецца.

Трэці працэс – канцэптуальны маніторынг. У працэсе канцэптуальнай апрацоўкі фактаграфічных даных аб масівах і патоках бібліяграфічных рэсурсаў праводзіцца супастаўленне статыстычных параметраў дакументнага патоку паміж сабой і чакаемымі значэннямі; устанаўліваюцца сувязі паміж прагнознымі індыкатарамі, параметрамі дакументнага потоку і зменамі ў вывучаемым аб'екце маніторынга. У ходзе гэтага працэсу аналізуюцца асобныя бібліяграфічныя крыніцы, супастаўляецца тэматыка інфармацыйна-бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэк і інфармацыйныя чаканні карыстальнікаў, прыярытэтныя напрамкі і праграмы, па якіх працуюць бібліятэкі (краязнаўства, тэматыка навуковых даследаванняў у краіне, актуальныя праблемы канкрэтных сацыяльных груп і г. д.). Менавіта канцэптуальны маніторынг з'яўляецца самым значным для вызначэння інавацый у складальніцкай бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк.

Вынікі канцэптуальнага маніторынга знаходзяць сваё адлюстраванне ў аглядах дзейнасці бібліятэк, у тым ліку бібліягра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фічнай дзейнасці па фарміраванні бібліяграфічных рэсурсаў, бібліятэк – метадычных цэнтраў, аглядах бібліяграфічнай прадукцыі, якія рыхтуюцца вядучымі спецыялістамі краіны па заяўцы Нацыянальнай кніжнай палаты і раз у пяць год выдаюцца як дадатак або ў складзе штогодніка «Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі», у навуковых публікацыях – манаграфіях, артыкулах, дысертацыйных даследаваннях бібліяграфазнаўцаў [1–7].

Разам з тым вывучэнне рэальнага ўзроўню бібліяграфічнага адлюстравання і аналізу вынікаў бібліяграфічнай дзейнасці ў краіне дазваляе сцвярджаць, што сёння не выкарыстоўваюцца ўсе магчымасці гэтага метаду, яго здольнасці адэкватна мадэліраваць бібліяграфічную практычную дзейнасць і яе вынікі. Праводзімая часткова работы не адпавядае сучасным патрабаванням маніторынгавых тэхналогій. Гэта звязана з адсутнасцю цэласнага сістэмнага падыходу да генерыравання бібліяграфічных рэсурсаў на розных узроўнях, са слабасцю метадычнага забеспячэння гэтага кірунку дзейнасці бібліятэк, асэнсавання новых тэндэнцый і засваення новых тэхналогій інавацыйнага бібліяграфічнага менеджменту, а таксама слабасцю арганізацыйнай, кадравай, выдавецкай базы вядучых бібліяграфічных служб, недастатковым выкарыстаннем найноўшых камп'ютэрных тэхналогій для адлюстравання і назірання за патокам бібліяграфічных рэсурсаў.

Выкарыстанне бібліяграфічнай кампаненты інфармацыйнага маніторынга сення знаходзіць сваё прымяненне ў разнастайных галінах ведаў, сферах дзейнасці. Бібліяграфія актыўна выкарыстоўваецца як інфармацыйны інструмент пазнання свету і прадстаўлення шматлікіх аб'ектаў і з'яў у саабразнай чалавечаму ўспрыняццю форме. Прыспеў час выкарыстання магчымасцей бібліяграфічных метадаў як складаючых інфармацыйнага маніторынга і на карысць самой навуковай, метадычнай, інавацыйнай бібліяграфічнай дзейнасці.


1. *Березкина, Н. Ю.* Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси / Н. Ю. Березкина, Л. А. Авгуль, Б. Б. Невский. – Минск : Красико-Принт, 2002. – 144 с.

2. *Зыгмантовіч, С. В.* Падрыхтоўка бібліяграфічнай прадукцыі – значны кірунак дзейнасці бібліятэк [Электронны рэсурс] / С. В. Зыгмантовіч // Публічная бібліятэка на пачатку XXI стагоддзя : зб.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

артык. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. В. А. Рынкевіч ; рэд. М. Г. Алейнік, А. Я. Іванова. – Мінск, 2008. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

3. *Киреева, Г.В.* Сводный каталог «Книга Беларуси»: к созданию полного библиографического репертуара белорусских изданий XVI–XVIII вв. / Г. В. Киреева // Інфармацыйныя рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: праблемы фарміравання і выкарыстання : зб. арт. – Мінск, 2008. – С. 120–129.

4. *Кузьминич, Т. В.* Национальная библиотека Беларуси как центр библиографической деятельности: современное состояние / Т. В. Кузьминич // Библиотековедение. – 2011. – № 2. – С. 91–95.

5. *Кузьмініч, Т. В.* Рэалізацыя канцэптуальных падыходаў фарміравання інфармацыйных рэсурсаў НББ: дзень сённяшні / Т. В. Кузьмініч // Інфармацыйныя рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: праблемы фарміравання і выкарыстання : зб. арт. – Мінск, 2008. – С. 5–13.

6. *Наварыч, Т.* Бібліяграфічная анталогія: да 50-годдзя з пачатку выдання бюлетэня «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» / Т. Наварыч // Бібліятэчны свет. – 2010. – № 3. – С. 27–30 : іл.

7. *Прадзеіна, А. В.* «Запаветны напеў, запаветная даль… Белавежская пушча»: (аб новым выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) / А. В. Прадзеіна, Н. В. Струц // Адукацыя і выхаванне. – 2010. – № 2. – 3-я с. вокладкі : іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ОПЫТ НАЦИОНАЛЬНОЙ БИБЛИОТЕКИ БЕЛАРУСИ ПО ПОПУЛЯРИЗАЦИИ БЕЛОРУССКОЙ КУЛЬТУРЫ И ЛИТЕРАТУРЫ В СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЯХ

***Е. В. Тулупова,***
*заведующий отделом справочно-информационного обслуживания Национальной библиотеки Беларуси*

Сохранение и популяризация ценностей белорусской книжной культуры, формирование документальной памяти нации является миссией Национальной библиотеки Беларуси (НББ). В соответствии со своим уставом [3] библиотека является хранителем культурных достижений белорусского народа, обладает богатейшей коллекцией документального наследия страны. Сегодня фонд НББ насчитывает более 9,6 млн ед. хранения, важную часть которого составляет самое полное в стране уникальное полумиллионное собрание документов, изданных на территории Беларуси с начала XIX в. до настоящего времени.